**Ніна Рашэтнікава,**
*БДУ, Мінск*

# АНТРАПАЛОГІЯ ГЕРОЯ
# Ў “МАЛАСТРАНСКІХ АПАВЯДАННЯХ” ЯНА НЭРУДЫ

.

Вобраз героя, як вядома, – гэта ўвасабленне пісьменніцкай канцэпцыі, а суаднесенасць каштоўнасных арыентацый аўтара і героя ляжыць у аснове літаратурнага твора, з’яўляецца яго стрыжнем. Аўтар можа па-рознаму даваць ацэнку герою, у тым ліку быць да яго нейтральным, вось чаму, асэнсоўваючы характар вобраза-персанажа, мы асэнсоўваем ідэйна-мастацкі змест твора. Пры гэтым значную ролю адыгрывае фон, дзе адбываюцца асноўныя падзеі ў творы, “маленькі чалавек на вялікім фоне свету, маленькія веды і ўпэўненасць у гэтых ведах чалавека на фоне бясконцага і бязмернага няведання, упэўненасць у сваёй цэнтральнасці і выключнасці аднаго чалавека побач з такой жа ўпэўненасцю іншых людзей – паўсюль тут эстэтычна скарыстаны фон становіцца момантам выкрыцця” [1, с. 21].

Фон можа быць не проста аб’ектам са сваімі контурамі, памерамі і аб’ёмам, але і першаасновай усяго ў лёсе чалавека.

Такім местам дзеяння ў “Маластранскіх апавяданнях” Яна Нэруды (1834 – 1891) з’яўляецца раён Прагі – Мала Страна. Дзякуючы творам Яна Нэруды, што друкаваліся ў розных часопісах (апавяданні выйшлі асобным выданнем у 1878 годзе) з 1875 па 1877 гады, гэтае месца ў чэшскай сталіцы стала знакамітым.

“Маластранскія апавяданні” – вяршыня мастацкай прозы пісьменніка, вядомага паэта, празаіка, публіцыста, грамадскага дзеяча, аднаго з заснавальнікаў грамадска-палітычнай і творчай арганізацыі “Май”, які вызначыўся ў славесным мастацтве ўменнем змяшчаць багацце жыцця ў вузкіх рамках жанраў.

Структура кнігі “Маластранскія апавяданні” складаецца з 13 твораў, аб’яднаных адзінай задумай – раскрыць унутраныя спружыны жыцця жыхароў Малай Страны, адсюль пануючая ў большасці твораў атмасфера, з характэрнымі для яе адсутнасцю руху і змен. Маластранцы жывуць сярод старамодных, пакрытых пылам рэчаў, што ў нечым спалучаецца з іх поглядамі на свет, нібыта пакрытых “пылам” забабонаў і прапісной маралі. Усё ў гэтым свеце круціцца вакол грошай і таго, што грошы прыносяць – добрай ежы, адзежы, абсталявання, павагі і зайздрасці суседзяў. Чалавек, пазбаўлены багацця, з цяжкасцю выжывае ў асяроддзі маластранцаў, але пры гэтым нідзе ў кнізе чытач не сустракае агіднага скажэння высокай чалавечай годнасці, звядзення чалавека да жывёльнага стану. Шматграннае адлюстраванне характару чалавека – яркая рыса творчасці Яна Нэруды. Чалавек у “Маластранскіх апавяданнях” вызначаецца тым, што ён не толькі

змяшчае ў сабе “супярэчлівасць шматвобразнасці, але і пераносіць гэтую супярэчлівасць і застаецца ў ёй роўным і верным самому сабе [2, с. 47].

У апавяданні “Як пан Ворэл абкурыў сваю люльку” герой цярпліва і са страхам чакае пакупнікоў у сваю краму ў доме “Ля зялёнага анёла”. Дзіўна і незразумела, што малады і прыгожы хлопец, з круглым тварам, бліскучымі блакітнымі вачыма, зграбны, нібы дзяўчына, да таго ж нежанаты, акрамя таго, – упэўнены ў тым, што гаспадыні да яго пойдуць, не можа дачакацца ніводнага пакупніка. Ці ёсць тут логіка? Вядома, што жывы характар заўсёды цэласны ўнутры сябе і кожная непаслядоўнасць у выніку аказваецца паслядоўнасцю.

Што з тэксту вядома чытачу пра пана Ворэла? Вядома, што пан Ворэл адкрыў краму там, дзе гэта нельга рабіць, кожная крама ў гэтым раёне пераходзіла ў спадчыну ад бацькі да сына, а калі б раптам перайшла да нейкага гасападара, які пераехаў з Прагі або з правінцыі, то мясцовыя жыхары глядзелі б на яго, як на чужынца, за выключэннем выпадку, калі б падпарадкаваўся нейкім чынам ранейшаму парадку і не выдумляў навацый [3, с. 29].

І тым не менш пан Ворэл не толькі адкрыў краму па продажы мукі і круп там, дзе раней не было аніякай крамы, і дзеля гэтага разбурыў сцяну на першым паверсе будынка, каб было выйсце на вуліцу, але і самаўпэўнена сябе паводзіць, нібыта не заўважае, што старажылы глядзяць на яго з пагардай, бо ён для іх чужы. Увечары пан Ворэл сядзіць у карчме “Жоўты дом” з куфлем піва на рагу стала каля печкі і заўсёды самотны. Ён настолькі заняты сваёй справай і мог бы шмат расказаць пра сваю краму акаляючым, што не заўважае, што яму непрыемна сядзець прыканцы стала, ды яшчэ ля печкі, а суседзі па сталу яго амаль не заўважаюць. Яны адзначаюць сярэбранае вяселле старога халасцяка, пана Ярмаркі, а той апавядае пра асноўную падзею: 25 год назад ён хацеў ажаніцца, але нявеста памерла. Кілішкі пераходзяць ад аднаго да другога (у гаспадыні было толькі дзве чаркі для віна), але да пана Ворэла яны не даходзяць, а між тым у яго сёння новая люлька, аздобленая серабром, і набыў ён яе з той прычыны, каб быць падобным да суседа.

І можна спытаць, чаму такія ўважлівыя да людзей і абставін, цярплівыя людзі, як пан Ворэл, так неразумна сябе паводзяць, не жадаюць бачыць таго, што ляжыць на паверхні? Напрыклад, прызнаць просты факт, што акаляючыя пана Ворэла людзі ажанілі яго з Полдынкай і цярпліва чакаюць, калі адбудзецца вяселле.

Ян Нэруда ў абмалёўцы характару персанажа не імкнецца вылучыць адзін нейкі бок, найбольш важную для асобы рысу, а паказвае ўсім ходы аповеду, як абставіны ўплываюць на чалавека і як чалавек паводзіць сябе пад уплывам абставін.

Пан Ворэл прызнаны суседзямі за гаспадара крамы толькі да моманту сустрэчы яго з паннай Полдынкай, і панна Полдынка гэта добра разумее. Яе словы – прысуд пану Ворэлу і яго справе: “Ён там так накурыў, што ўсё нібы копчанае” [3, с. 31]. Ці разумее гэта галоўны герой твора? Тут дарэчы будзе прывесці словы Л. М. Талстога: “Як добра было б напісаць мастацкі твор, дзе б ясна выказаць цякучасць чалавека: тое, што ён адзін і той жа, то злодзей, то анёл, то мудрэц, то ідыёт, то асілак, то абяссіленная істота” [2, с. 48 –49].

Пачуцці чалавека, яго ўява пра жыццёвы поспех у апавяданні “Як пан Ворэл абкурыў сваю люльку” сутыкаюцца з жорсткай неабходнасцю, што ў выніку і прыводзяць героя да самазабойства. Жорсткая неабходнасць, як паказана Янам Нэрудай, абумоўлена праўдай жыцця чалавека, пазбаўленага матэрыяльнай забяспечанасці.

Пан Ворэл надае вялікую ўвагу знешняму выгляду: ён чакае пакупнікоў апрануты ў кароткую шэрую камізэльку і белыя суконныя штаны. Калі ў яго краму прыходзіць панна Полдынка “кругленькая, невысокая паненка з шырокімі плячыма і сцёгнамі, якая выглядае старэйшай за свае дваццаць год” [3, с. 30], ён робіць два крокі назад і кладзе на прылавак люльку. Ну, нічога, ну няўдалы дзень, ну прышлюць яшчэ пару дзяўчат, а раптам!..

Маластранцы ў гэтым выпадку аказаліся мацней за дастаткова падрыхтаванага, вытрыманага і заможнага гаспадара. Значэнне пана Ворэла для гэтага раёна яны добра пралічылі, бо пані сотнікава сваёй незамужняй дачцэ такім чынам яго ахаратарызавала, што панна Полдынка адразу ўсё зразумела – “манкі купі ў гэтага новага, трэба пакаштаваць” [3, с. 29].

У апавяданні ёсць важныя для разумення канцэпцыі словы, якія патрэбна правільна прачытаць у тэксце, каб падысці да асэнсавання твора не з вышыні, а падкапывацца паступова знізу, філалагічна разгледзець яго рухаючыя сілы. Першае ключавое слова “пакаштаваць”. Яго прамаўляе пані сотнікава з упэўненасцю дачцэ, якая збіраецца ў краму, што значыць – зазірні да новага гандляра, купі манкі, бо надышоў час ужо пакаштаваць. У гэтым выразе несхаваная пагроза, прымус, так паступова нарастае трагізм у творы. Вядома, што ў межах чалавечага “я – у – свеце” аналагам смерці выступае амаль кожная жорсткая ўпарадкаванасць і завершанасць, тады як аналагам жыцця – дынамічны эвалюцыйны працэс непарыўнага, цякучага, паступовага станаўлення як асобы, так і ўзаемаадносін паміж людзьмі.

Другое значнае слова, найважнейшае ў кампазіцыі твора – гэта “люлька”. Пан Ворэл набыў новую люльку, аздобленую серабром, для таго, каб быць падобным да суседа. Сусед яго, пан Ярмарка, 18 лютага адзначаў сярэбранае вяселле ў карчме “Жоўты дом”. Чытача павінна здзівіць, што пан Ворэл не зважае на тое, што сядзеў ён у карчме самотны, што з ім амаль не віталіся, што размова сціхала, калі ён заходзіў. Не менш дзіўнымі з’яўляюцца паводзіны героя твора на карнавале жыцця, які ладзіць у карчме Ярмарка, адзначаючы сваё сярэбранае вяселле з нявестай, што памерла дваццаць пяць

год назад: пан Ворэл не звярнуў увагу на той факт, што ніводзін кілішак не трапіў да яго. А між тым свята ладзілася менавіта для пана Ворэла.

Апавяданне завяршаецца наступным чынам: “А дзесятай гадзіне прыйшла судовая камісія і ўвайшла ў краму праз дом. Яны знялі самазабойцу, дапамагаў ім паліцэйскі камісар з Малай Страны, пан Умюль. Ён залез у кішэнь камізэлькі нябожчыка і выцягнуў адтуль люльку. Патрымаў яе на святле і сказаў: “Я такую выдатна раскураную люльку яшчэ не бачыў, паглядзіце” [3, с. 32].

У словах камісара паліцыі заключана разуменне таго, што адбылося з панам Ворэлам: блюзнерскія, прафанна-анекдатычныя адносіны да шлюбу вядуць да смерці, таму што парушаюць таямніцу ўсталяваных узаемаадносін паміж людзьмі.

Агульнавядома, што праз сістэму персанажаў выражаецца адзінае аўтарскае ўяўленне пра чалавека, пра яго ўзаемаадносіны з акаляючым светам. Цэнтральныя фігуры могуць утвараць пары, трохкутнікі і г.д. Тыпы персанажаў, іх колькасць, суадносіны, апірышча на традыцыю – усё дапамагае спасцігнуць цэласную карціну свету, створаную пісьменнікам у кнізе. Не меншае значэнне мае і расстаноўка персанажаў у творы. У апавяданні “Тыдзень у ціхім доме” (гэтым творам пачынаюцца “Маластранскія апавяданні”) у цэнтры падзей галоўны герой, ад імя якога вядзецца аповед. Аўтар не адразу раскрывае чытачу прычыну таго, чаму гэты персанаж настолькі напружана ўспрымае людзей і падзеі вакол сябе. Фактычна толькі ў канцы твора паводзіны героя становяцца зразумелымі.

Пры ўважлівым разглядзе тэксту можна заўважыць, што ўсе творы ў “Маластранскіх апавяданнях” Яна Нэруды злучаны паміж сабой у тым ліку і каштоўнаснымі арыентацыямі герояў, што могуць быць убачаны праз факт матэрыяльна-побытавай культуры, што асабліва характэрна для апавядання “Тыдзень у ціхім доме”. “Ціхі” дом вызначаецца надзвычай складанымі ўмовамі жыцця чалавека, калі не хапае прасторы і чалавек вымушаны ўвесь час стрымліваць сябе, падпарадкоўвацца абставінам, прыслухоўвацца да суседзяў. Аўтар дазваляе чытачу разгледзець карціны прадметнага свету, убачыць адпаведнасць карцінам прадметнага свету партрэтных характарыстык, дзе асоба ўважліва дастаткова ярка і поўна ў рысах твару і асаблівасцях постаці. Рысы ўнутранага жыцця, звычкі і знешнасць часта з’яўляюцца ўзаемаабумоўленымі і непасрэдна звязанымі. У тэксце “Пані гаспадыня – гэта жанчына з надзвычай вострымі рысамі твару, знешні выгляд прыплюснутасці з востра вытыркаючай барадой. У акулярах яна шые вельмі ўважліва з нейкага грубага палатна. Чорныя, выбітыя на палатне штэмпелі сведчаць, што гэта салдацкая бялізна. Паненка, як гэта выказнуцца карацей, бландзінка самага невыразнага гатунку. Яе твар падобны на твар маці, толькі рысы яго не такія вострыя, а трохі прыглушаныя, і вострая барада мае нават нейкую прывабнасць маладосці” [4, с. 21].

Як бачым, стыль Яна Нэруды вызначаецца тым, што праз знешні воблік чалавека выяўляецца яго ўнутраны свет. З пункту гледжання аксеалогіі гераіні Яна Нэруды (маці і дачка) цалкам падпарадкаваны пазбаўленай жыцця руціне, стэрэатыпам асяроддзя. У творы падкрэсліваецца, што гераіні хаваюць ад суседзяў беднасць, змушанасць працаваць за зусім нязначныя грошы, жыць адначасова ў канкрэтнай рэчаіснасці і ва ўласным свеце. У гэтай шэрасці існавання амаральнасць не асуджаецца жыхарамі дома і не падвяргаецца сумненню зло, але калі вастрыё зла звернута на той ці іншы персанаж, узнікае нешта, што не можа быць проста вытлумачаным.

Пісьменнік у творы свядома пакідае чытачу магчымасць паразважаць над асобнымі фактамі жыцця герояў, каб убачыць шматбаковасць жыцця ва ўсёй яго складанасці. Падкрэслім, што ў апісанні знешняга выгляду персанажаў амаль адсутнічае гіпербалізацыя, а ў апісанні паводзін – іронія. Надзвычай важным для характарыстыкі вобраза-персанажа з’яўляецца свет матэрыяльны, што зліта ў адно цэлае з душэўнымі перажываннямі герояў, іншымі словамі, прадметы інтэр’еру і дробныя рэчы, акаляючыя персанажа, служаць важнымі дэталямі ў мастацкім тэксце. Маем на ўвазе: міску з чарніламі, вершы на нямецкай мове, што перапісваюцца ў альбом і г.д. Гісторыю ўзаемаадносін двух персанажаў, Ёзэфіны і доктара, аўтар перадае ў творы з усімі падрабязнасцямі, а назва раздзела “Старому халасцяку ніколі не шанцуе (прыказка)” ёсць адносіны пісьменніка да людзей і абставін. Ян Нэруда цалкам на баку тых, каго можа шантажыраваць доктар, які валодае некаторымі ведамі пра жыхароў дома, працуючы з дакументамі ў гарадской управе. Маёмасць людзей – гэта амаль усё, чым яны валодаюць, адсюль няшчасце жыхароў дома, калі дакументы не сугучны. На шчасце доктар таксама мае свае слабыя месцы і ёсць людзі, якія пра гэта ведаюць.

Можна смела аднесці “Маластранскія апавяданні” да класікі сусветнай літаратуры, тым больш, што літаратуразнаўцы даўно ставяць гэтую кнігу Яна Нэруды ў адзін шэраг з найлепшымі творамі еўрапейскай літаратуры, напрыклад, творамі Гі дэ Мапасана і Антона Паўлавіча Чэхава, падкрэсліваючы значэнне мастацкай дэталі ў стварэнні вобраза-персанажа.

**Літаратура**

1. Бахтин, М. М. Эстетика словесного творчества / М. М. Бахтин. – М. : Искусство, 1979. – 423 с.

2. Левидов, А. М. Автор – образ – читатель / А. М. Левидов. – Л. : Издательство ЛГУ, 1983. – 326 с.

3. Ад падання да рамана. Выбраныя творы чэшскай прозы XIX – першай паловы XX стагоддзя: вучэб. дапам. / склад. пер. з чэш. мовы, аўт. камент. Н. Б. Рашэтнікава. – Мінск: Выдавецкі цэнтр БДУ, 2010. – 161 с.

4. Neruda, J. Povidki malostrancki / J. Neruda. – Praha, 2009.